Источник"Звязда" - 2013-09-17

Даты | Падзеі | Людзі



**1891** год — нарадзіўся (вёска Бацэвічы, цяпер Клічаўскі раён Магілёўскай вобласці) Аркадзь Антонавіч Смоліч, беларускі географ, картограф, першы прафесар геаграфіі ў Беларусі (1927). Адзін са стваральнікаў Беларускай акадэміі навук, суаўтар яе першага статута (1928). Аўтар вучэбнага дапаможніка «Геаграфія Беларусі». Арганізаваў Цэнтральнае бюро краязнаўства і часопіс «Плуг». Абгрунтаваў навуковыя задачы геаграфіі па вывучэнні ландшафтаў з улікам іх генезісу, эвалюцыі, складу і прасторавага размяшчэння. Распрацаваў праграму эканоміка-геаграфічнага вывучэння раёнаў БССР (1930), стварыў карту размяшчэння насельніцтва Беларусі (1929). У 1931 годзе рэпрэсаваны. У 1938-м расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957-м.

**1912** год — нарадзіўся (вёска Пількаўшчына, цяпер Мядзельскі раён Мінскай вобласці) Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко), народны паэт Беларусі (1968), акадэмік НАН Беларусі (1972), Герой Сацыялістычнай Працы (1974). Удзельнік рэвалюцыйна-вызваленчага руху ў Заходняй Беларусі. Неаднаразова арыштоўваўся польскімі ўладамі, прысуджаўся да турэмнага зняволення. У Вялікую Айчынную вайну — супрацоўнік газеты «За Савецкую Беларусь», газеты-плаката «Раздавім фашысцкую гадзіну». З 1945 года працаваў у часопісе «Вожык». Аўтар паэтычных зборнікаў «На этапах», «Пад мачтай», «Праз вогненны небасхіл», «Нарачанскія сосны» і іншых. Пісаў для дзяцей. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1948), Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1966). Памёр у 1995 годзе.

**1940** год — лётчыкі брытанскага Каралеўскага паветранага флоту атрымалі адну з самых бліскучых перамог у Другой сусветнай вайне. Яны адбілі дзве магутныя атакі германскіх ВПС і спынілі масіраванае ўварванне на Брытанскія астравы войскаў вермахта. У небе над Альбіёнам быў знішчаны 61 самалёт праціўніка. Страты англічан былі ўдвая меншымі — 29 машын. Даведаўшыся пра паражэнне ў небе над Англіяй, Гітлер адмяніў загад аб дэсанце на Брытанскія астравы, хоць бамбёжкі працягваліся. Яшчэ за тры месяцы да таго Брытанія не мела баяздольных ВПС. Чэрчыль, які стаў прэм'ер-міністрам у маі 1940 года, выклікаў да сябе ваеннага міністра Бівербрука. Ён загадаў яму неадкладна сабраць усіх уладальнікаў і дырэктараў авіяпрадпрыемстваў і аб'явіць ім аб нацыяналізацыі іх заводаў. Здзіўлены Бівербрук спаслаўся на адсутнасць закону аб нацыяналізацыі. «Да таго часу, калі вы іх збераце, закон ужо будзе прыняты», — запэўніў яго Чэрчыль.

## Было сказана

**Уладзімір КАРАТКЕВІЧ, паэт, празаік, драматург, публіцыст, перакладчык, кінасцэнарыст:**

*«Самая страшная пасля прагнасці чалавечая загана — нецярпімасць».*

"Звязда". Даты. Падзеі. Людзі